Упершыню ўвесь Супрасльскі зборнік быў выдадзены ў 1836 г. М. А. Абаленскім, прычым другая яго частка атрымала загаловак «Киевская сокращенная летопись» [14]. Гісторыя гэтай публікацыі разгледжана В. Л. Новікавай [15]. Аднак у канцы XIX ст. Ю. І. Ціхоўскі выказаў меркаванне, што дадзены летапіс мае хутчэй смаленскае паходжанне [16, с. 365–371]. Да такой жа высновы прыйшоў і В. А. Арнаутаў, які падрабязна аргументаваў гэту гіпотэзу [17, с. 1–34]. Пазней, з прычыны таго, што апошнія арыгінальныя фрагменты летапісу датычацца галоўным чынам падзей на Валыні, М. М. Улашчык выдаў яго пад назвай «Валынскі кароткі» разам з іншымі помнікамі беларускага летапісання [18]. Гэта найменне і замацавалася за помнікам у сучаснай навуцы, хаця і з'яўляецца дыскусійным.

Што датычыцца даты стварэння «Пахвалы», то тут варта разглядаць часавы прамежак паміж 1515 (у помніку апісваецца трыумфальны ўезд аршанскага пераможцы ў Вільню ў самым канцы 1514 г.) і 1530 гг. (год смерці Канстанціна Астрожскага, якому аўтар жадае «здоровье и щастье вперед лепшее как ныне» [18, с. 127]). Словы «так ныне побил силу великую московскую, абы так побивал силную рать татарскую, проливаючи кров их бесурменьскую» [18, с. 127] сведчаць пра тое, што на момант стварэння «Пахвалы» яе аўтар, верагодна, яшчэ не ведаў пра перамогу гетмана над крымскімі татарамі ў бітве пад Альшаніцамі ў студзені 1527 г. А. А. Семянчук нават выказала здагадку, што «Пахвала» была створана напярэдадні выправы на татар [3, s. 93]. У сваю чаргу А. У. Русіна лічыць, што згаданы ўрывак не звязаны з гістарычнай канкрэтыкай і мае хутчэй пераймальны характар [10, с. 144]. Аднак наўрад ці бітва пад Альшаніцамі, якая сваімі маштабамі пераўзыходзіла Аршанскую баталію, магла б застацца без увагі стваральніка «Пахвалы».

Усё тая ж А. У. Русіна ўзнімае ніжнюю храналагічную планку часу стварэння помніка да 1522 г. У якасці доказу яна прыводзіць словы панегірыста пра тое, што за свае подзвігі Канстанцін Астрожскі дастойны валодаць «самим Божьим градом Иерусалимом», а не толькі сядзець на «здешних великих столечных городах» [18, с. 126]. На думку даследчыцы, сутнасць гэтай згадкі заключаецца ў «казусе 1522 г.», калі Астрожскі, які на той момант ужо займаў пасаду віленскага кашталяна, стаў яшчэ і ваяводам троцкім. Гэта ў сваю чаргу не задаволіла іншых магнатаў – яны спасылаліся на прывілей 1413 г., што забараняў займаць такія высокія пасады некатолікам [9, с. 162]. Адзначым, што з 1522 г. можна звязаць і ўзгаданы вышэй заклік «побивать силную рать татарскую», бо ў гэты год было падпісана пяцігадовае перамір'е паміж ВКЛ і Масквой і, магчыма, такім чынам у тэксце быў зроблены акцэнт на новых вайсковых задачах гетмана. З улікам гэтага мае сэнс звузіць меркаваны час стварэння вядомага нам варыянта «Пахвалы» да 1522–1526 гг.

Пэўную праблему складае і вызначэнне асобы аўтара «Пахвалы». Як адзначае В. А. Чамярыцкі, агульны характар усяго Супрасльскага зборніка, а таксама змест, мова і стыль яго заключных арыгінальных запісаў паказваюць на тое, што «гэта летапісная кампіляцыя ўзнікла ў асяроддзі патрыятычна настроенага беларуска-ўкраінскага духавенства» [7, с. 385]. Аднак, калі ў дачыненні да валынскай часткі зборніка гэтае меркаванне выглядае цалкам слушным, то ў выпадку з «Пахвалой» сітуацыя менш адназначная.

Можна пагадзіцца з высновай С. Л. Гараніна, што твор стаў вынікам асабістай цікавасці аўтара да асобы князя Астрожскага і тых якасцей, жывым увасабленнем якіх гетман быў для часткі тагачаснага грамадства ВКЛ [4, с. 217]. Аднак застаецца пытанне наконт катэгарыяльнага апарату ананімнага панегірыста. Быў гэта абазнаны ў хрысціянскай дагматыцы святар, у чыёй свядомасці кожная зямная падзея была толькі сімвалам, знакам, эфемерным вобразам складаных і непазнавальных для смяротнага чалавека тагасветных працэсаў? Альбо міранін, што ведаў некаторыя творы духоўнай і свецкай літаратуры, валодаў тэхнікай кампілятарства і адлюстраваў у пісьмовай форме ўласныя перажыванні наконт лёсу роднай зямлі? Спробу канкрэтызаваць аўтара «Пахвалы» здзейсніла А. У. Русіна, якая лічыць, што гэта мог быць пісар князя Канстанціна Астрожскага – Даніла Васільевіч, чыя асоба звязала паміж сабой гетмана і смаленскага епіскапа Варсафонія (ён узгадваецца ў «Пахвале» і валынскай частцы летапісу), Валынь і Супрасльскі манастыр [9, с. 162–167]. Паводле другой версіі, магчымым аўтарам помніка мог быць пісар вялікакняжацкай канцылярыі Фёдар Святоша [6, с. 234]. У любым выпадку ні адна з гэтых здагадак пакуль не мае досыць пераканаўчых доказаў, таму праблема аўтарства помніка пакуль далёкая ад канчатковага вырашэння.

У той жа час тэксталагічны аналіз твора дае магчымасць контурна акрэсліць інтэлектуальны запас невядомага аўтара. На думку У. І. Кананoвіча, на стыль панегірыста магла паўплываць тагачасная канцылярская лексіка [2, с. 737]. Акрамя таго, як паказала А. У. Русіна, у тэксце «Пахвалы» ўжываюцца асобныя вобразы, параўнанні, а часам нават і цэлыя славесныя звароты з сербскай рэдакцыі «Александрыі» – перакладнога рамана пра Аляксандра Македонскага, які атрымаў распаўсюджанне ў ВКЛ у XV ст. Аднак падчас працы над сваім творам аўтар выкарыстаў толькі некаторыя «падзейна-рыцарскія» трафарэты з рамана, пакінуўшы па-за ўвагай яго багатую сімволіку. Ды й сам па сабе адбор гэтых трафарэтаў выглядае даволі супярэчліва. Адным з самых паказальных прыкладаў не зусім асэнсаванага запазычання стваральнікам «Пахвалы» асобных фрагментаў «Александрыі» з'яўляецца апісанне фарсіравання Дняпра войскам на чале з князем Астрожскім, якое ледзь не слова ў слова скапіравана з сербскай рэдакцыі «Александрыі»:

Пахвала князю Канстанціну Астрожскаму	Сербская «Александрыя» па спісе XV ст.
«И въспомяну справу и смелость храброго Антиоха и великого гетмана царя Александра Макидоньского, како он воиску персидскому реку Арсинарскую преити повел, **пръвии сквасишася, а последнии яко по суху преидоша**, так теж и он передним людем плыти повеле, а последнии вже яко по броду преидоша» [18, с. 125–126].	«В кый час Порова воинства обедати начаша, тогда Филон, челом ударив Александру, чрес реку прескакавше, на поле **предние свалишася, а задние, яко по суху, преидоша**» [19, с. 151].

У дадзеным выпадку аўтар блытае эпізоды рамана, звязаныя з рознымі асобамі (Антыёхам і Філонам). Самога гетмана ён атаясамлівае з героямі «Александрыі» таксама непаслядоўна: то з Антыёхам, то нават з ворагам Аляксандра – індыйскім царом Порам («великого царя индийского Пора, которому ж многи цари и князи противни быти не могоша» [18, с. 126]).

У іншым месцы панегірыст, спасылаючыся на «философа Фролоса», параўноўвае гетмана з уладаром Арменіі Тыгранам Вялікім: «И тако мужества храбрость подобна Тигранису, царю арменскому, о котором же премудрый философ Фролос от Ливия пишеть: пришедши Тигранис, царь арменский, и съсеклъся сх Антиохом и измог войско его и самого из града выгнал, Антиоху бьжавшу пред ним в Перскую сторону» [18, с. 126]. Як заўважыла А. У. Русіна, пад «Фроласам» тут варта разумець рымскага гісторыка Луцыя Анея Флора, які склаў кампендыум прац Ціта Лівія («Эпітомы»). Але даследчыца лічыць, што аўтар «Пахвалы» быў не знаёмы з гэтым творам: дадзеную звестку ён узяў з «Хронікі» Іаана Малалы, часткова змяніўшы і скараціўшы яе [10, с. 141]. Акрамя таго, яшчэ чакаюць свайго даследавання магчымыя выкарыстанні панегірыстам запазычанняў са старажытнарускага перакладу «Гісторыі Іўдзейскай вайны» Іосіфа Флавія і шэрагу іншых твораў сярэднявечнага свецкага пісьменства.

Таксама аўтар «Пахвалы» актыўна выкарыстоўваў у сваёй працы Біблію і іншую рэлігійную літаратуру, але і тут часам дапускаў блытаніну. Напрыклад, ён спасылаецца на «слово пророчь-

ское», хаця цытуе адзін з апостальскіх лістоў (Як. 4:6 ці 1 Пят. 5:5): «Господь гръдым противится, а смиренным милость и помощь посылаеть» [18, с. 125]. У іншым месцы ўзгадваюцца словы прарока Ісаі: «Помянем слово пророка Исаия, сына Амосова, што пророчьствовал о последних днех, провидев духом святым, так рече: За умножение злобы людеи и многыи их неправды пролиется кров их, яко вода силна, хоробрыи и гръдыи от мечов падуть, один ратныи справедливыи погонить несправедливых 100, а от ста побегнета 1000 и плоть их будет на снедь зверем и птицам, и кости их на позор всякому животну» [18, с. 126]. Аднак у Кнізе Ісаі такі фрагмент адсутнічае, хаця ён і перагукаецца з іншымі кнігамі Святога Пісання (Друг. 32:30; Ез. 34:4-5; Ер. 7:33, 16:4, 34:20; Лев. 26:8; Нав. 23:10; Пс. 78:2-3, 90:7; 1 Цар 17:46 і інш.). Між тым вельмі падобныя ўрыўкі змешчаны ў помніках наўгародскага летапісання. Па-першае, у аповесці пра Ліпіцкую бітву 1216 г., якая ўтрымліваецца ў Сафійскім I летапісе: «Яко тобою ся намъ много зла сотвори, про твое преступление крестное речено бысть: “Приидите птица небесныя, напитаитеся крови человеческыя; звѣрие наядитеся мясъ человеческых: не 10 бо убито, ни 100, но тысуща тысущами”» [20, стб. 271]. Па-другое, у аповесці пра Ракаворскую бітву 1268 г. з Наўгародскага I летапісу: «И пакы помянемъ Исаия пророка, глаголюща, аще хощете послушати мене, благая земная снѣсте; аще ли не хощете, ни послушаете мене, оружие вы поясть, и тако поженеть единъ 100 васъ, а от ста побѣгнет 1000 васъ» [21, с. 87]. Апошняя цытата сапраўды часткова перадае змест двух вершаў Кнігі Ісаі (Іс. 1:19-20). Магчыма, што згаданы фрагмент «Пахвалы» ўзнік у выніку перапрацоўкі нейкай нявызначанай крыніцы (летапіснай звесткі, тлумачэння на пароцкія кнігі і г. д.), якая ў сваю чаргу засноўвалася на Кнізе Ісаі. Таксама аўтар «Пахвалы» паказаў сваё знаёмства з Другой кнігай Параліпаменан: узгадваючы адзін з яе эпізодаў (2 Пар. 13:17), ён параўновае гетмана з іўдзейскім царом Авіяй: «Уподобился еси сыну Ровоавову Авию, што воевал на десять колен Израилев и въбил з них силных людеи за един день пятьсот тисячь, его же делу и ты наследник явися, москвич избиваа не в целыи день, але во дни 3 годины на осмъдесят тисяч побил» [18, с. 126].

Акрамя непасрэдна Святога Пісання аўтар «Пахвалы» карыстаўся «Словам пра ўваскрэсенне мёртвых» Яфрэма Сірына («Зде исполнилося слово святого отца Ефрема: “Силныи изнеможе, а здоровыи разболелся, а радовавыися въсплакал, а дръжаи погубил”» [18, с. 126]) і «Жыціем Ніфанта Канстанцкага». З апошняга ён узяў фразу пра «тайну цареву», якая, дарэчы, прысутнічае і ў іншым узоры панегірычнай прозы ВКЛ – «Пахвале вялікаму князю Вітаўту»:

Пахвала вялікаму князю Вітаўту	Пахвала князю Канстанціну Астрожскаму
«**Тайну цареву таити добро есть, а дела велика господаря поведати добро жь есть**. Хочю вам поведати о великом князи Александри, зовемом Витовти, литовском и руском, иных многих земель господари» [22, с. 250].	«Успомянем слово великого Нифонта, как пишетъ к верным христианам: **таину цареву годно таити, рекучи: рады госпадарское замкнутое негодно всим поведати**, але дело и мужества доброго и смелого человека годно всим объявляти, бы напотом иншии тому вчили и смелость мели как же и в нынешнее время случися нам видети того доброго а храброго воина, пореклом стратилата князя Костянтина Ивановича Острозского, навышшего гетмана литовского» [18, с. 125].

Цікава, што першакрыніцай фразы выступае Кніга Тавіта: «Тайну цареву прилично хранить, а о делах Божиих объявлять похвально» (Тав. 12:7). Прыкладна ў такім выглядзе яна звычайна і ўжывалася ў сярэднявечных помніках агіяграфічнай літаратуры [23, с. 293–294], у тым ліку і ў «Жыціі Ніфанта Канстанцкага» («Таиноу оубо цареву достоить хранити, а дела божьствѣная проповедати славьно» [24, с. 69]). Аднак складальнікі абодвух пахвальных твораў не толькі адступаюць ад літаральнага цытавання, але і дазваляюць сабе амаль ідэнтычныя па сэнсе рэмаркі, якія змяняюць агульны кантэкст першакрыніцы («а дела велика господаря поведати добро жь есть» і «але дело и мужества доброго и смелого человека годно всим объявляти»). Гэта ў сваю чаргу прымушае звярнуць увагу на дапушчэнне В. А. Чамярыцкага, быццам стваральнік «Пахвалы» наследаваў у гэтым месцы панегірыку Вітаўту [25, с. 86]. Хаця магчыма, што аўтары дадзеных твораў арыентаваліся на нейкі іншы літаратурны ўзор.

З улікам адзначанага вышэй наўрад ці будзе вялікім перабольшаннем сказаць, што выкарыстаныя стваральнікам «Пахвалы» запазычанні з духоўнай літаратуры маюць выключна мастацка-публіцыстычны характар.

Неабходна таксама зрабіць заўвагу наконт жанру разглядаемага помніка. Традыцыйна яго пазначаюць у адпаведнасці з маргіналіяй «Се похвалу гетману» і рытарычным пытаннем аўтара «О пречестнаа мудраа главо, како тя нареку и похвалю?», з якіх пачынаецца другая частка твора. Увогуле ў старажытнарускай літаратуры жанр пахвалы быў прадстаўлены як у выглядзе самастойных тэкстаў, так і ў якасці ўстаўных канструкцый (кароткая пахвала) унутры іншых помнікаў. Пры гэтым кароткая пахвала пераважна выконвала функцыю своеасаблівага некралога, якім завяршаўся летапісны аповед пра князя ці царкоўнага дзеяча або жыціе святога. Як адзначае Н. У. Трафімава, у праваслаўным светаразуменні пахвала звязана з грахом гордасці і менавіта таму часцей за ўсё пахвальныя словы ўжываліся ў дачыненні да памерлых [26, с. 169–170]. У сваю чаргу «Пахвала» створана яшчэ пры жыцці гетмана, што хаця і не з'яўляецца беспрэцэдэнтным выпадкам, але ўсё ж дае нагоду пераасэнсаваць яе жанравую прыналежнасць.

Разглядаемы твор мае некаторыя рысы, якія набліжаюць яго да воінскай аповесці. Галоўнымі жанраўтваральнымі прыкметамі помніка з'яўляюцца вобраз Канстанціна Астрожскага як военачальніка і апісанне бітвы пад Оршай. Звяртае на сябе ўвагу і характэрная паслядоўнасць элементаў сюжэтнай структуры тэксту: вызначэнне прычын узброенага канфлікту (пралог); збор войска; наведванне палкаводцам храма напярэдадні бітвы; апісанне бітвы; аповед пра наступствы бітвы; усхваленне пераможцы і яго воінскіх якасцей; трыумфальнае вяртанне военачальніка ў сталіцу; здравіца і пажаданне новых вайсковых перамог (эпілог). Такім чынам, сюжэт мае выразна эпічны характар і ўключае тры абавязковыя для воінскай аповесці кампазіцыйныя часткі: аповеды пра падрыхтоўку да бітвы, а таксама пра яе ход і наступствы [26, с. 13]. У той жа час кульмінацыя (непасрэдна бітва) пададзена ў сціслым выглядзе, з чаго можна зрабіць выснову, што для аўтара важней была эмацыянальная ацэнка падзей, а не іх падрабязнае апісанне. На апошняе таксама паказваюць і ўведзеныя ў структуру «Пахвалы» такія дадатковыя лірычныя элементы, як пахвальнае слова і здравіца. Пры гэтым у творы адсутнічаюць уласцівыя воінскім аповесцям апісанні знакаў, цудаў і г. д. На думку І. В. Саверчанкі, які адзначыў высокую ступень рытмізаванасці тэксту помніка, на сінтаксічным і лексічным узроўнях аўтар «Пахвалы» арыентуецца на паэтыку ўзнёсла-гераічнага, быліннага эпасу [6, с. 234]. Аб прыналежнасці твора да гераічнай традыцыі старажытнарускай славеснасці сведчаць таксама таўталагічнасць эпітэтаў, «панарамнасць» аўтарскага бачання і шматлікія гістарычныя адсылкі.

З жанрам воінскай аповесці помнік звязвае і пабудаваная на антытэзе вобразная сістэма: сціплы супрацьстаіць ганарліваму. «Пахвала» пачынаецца з паведамлення пра тое, што вялікі князь маскоўскі Васілій III, на якога ўскладаецца віна за развязванне вайны, «преступив докончание и крестное свое целование от меншаго на блъшее зло подвигнулся, имеа ненасытную утробу лихоимениа», захапіў Смаленск і іншыя гарады ВКЛ. Далей аўтар узмацняе эмацыянальнае ўздзеянне гэтага фрагмента песімістычнай сентэнцыяй: «Бо нет пущаго человеку как въжделене чюжого имениа, и кроткаго и смиренаго немилостива и некротка чинить» [18, с. 125]. У сваю чаргу кароль і вялікі князь Жыгімонт Казіміравіч у адрозненне ад маскоўскага ўладара «свою правду дръжал ему непорушно и невыступно в всем» [18, с. 125]. Таму Жыгімонт выправіўся на вайну «помянувши слово пророчьское, што Господь гръдым противится, а смиренным милость и помощь посылаеть» [18, с. 125]. Аўтар «Пахвалы» падкрэслівае, што менавіта пыха Васілія III стала ў выніку галоўнай прычынай паражэння маскоўскага войска пад Оршай. Сваю думку ён падмацаваў ужо згаданай спасылкай на прарока Ісаю: «За умножение злобы людеи и многыи их неправды пролиется кров их, яко вода силна, хоробрыи и гръдыи от мечов падуть, один ратныи справедливыи погонить несправедливых 100, а от ста побегнета 1000 и плоть их будет на снедь зверем и птицам, и кости их на позор всякому животну» [18, с. 126].

Мячом жа справядлівай боскай адплаты стаў галоўны герой твора – Канстанцін Астрожскі: «Подарил Бог князя Костянтина Ивановича, навышшего гетмана литовского, што его справою и зряжением воиска плъков и его смелого сердца и рукы сягненьем люди московского побили» [18, с. 126]. З-пад пяра панегірыста выйшаў каларытны, хаця і шмат у чым ідэалізаваны вобраз «доброго а храброго воина», «славнаго и великоумного» гетмана. Астрожскі – «справца военныи», выдатны «стратилат», чыя «мужства крепость» роўная мужнасці герояў далёкай мінуўшчыны і дзякуючы «смелого сердца и рукы сягненьем» якога была здабыта вялікая пера-

мога над моцным ворагам. Лёгка заўважыць, што пры апісанні свайго героя аўтар «Пахвалы» не быў арыгінальным і выкарыстоўваў вайсковыя лексічныя і сітуацыйныя формулы з агульнага фонду вядомай яму літаратуры. У рытарычным запале ён нават наракаў на тое, што не можа годным чынам усхваліць усе добрыя якасці гетмана: «О пречестнаа мудраа главо, како тя нареку и похвалю? Коротъкостию языка моего и художством ума моего не могу ся домыслити, кую славу и честь въздати твоего справлению делу» [18, с. 126]. Разам з тым аўтар унёс у свой тэкст своеасаблівы элемент псіхалагізму – Астрожскі паказаны жывым чалавекам, якому таксама ўласцівы няўпэўненасць і душэўныя ваганні. Так, калі яго войска падышло да Дняпра, гетман засмуціўся, што «яко бысть не борзо преходим путь водныи». У сумненнях ён «бег до церквии святои живоначалнои Троици и к святому великому чюдотворцу Христову Николе и, пад, помолися Богу». У выніку боская ласка і ўласная кемлівасць дапамаглі палкаводцу фарсіраваць раку: «Он передним людем плыти повеле, а последнии вже яко по броду преидоша» [18, с. 125–126]. Увогуле гетман паўстае ў «Пахвале» як «богобоязнивыи муж», чыя хрысціянская дабрадзейнасць праявілася таксама і ў тым, што «напръвеи церкви божьи христианьскии и многых мужеи и жон от их насилованья оборонил» [18, с. 126]. Тут варта дадаць, што ўдзячны за аршанскую перамогу Жыгімонт дазволіў Канстанціну Астрожскаму пабудаваць у Вільні мураваныя праваслаўныя цэрквы – Нікольскую і Траецкую. Гэта не толькі ўскосна адмяніла папярэднюю Казіміраву забаронную грамату, але і замацавала за гетманам нефармальны статус галоўнага абаронцы праваслаўя ў ВКЛ [27, с. 139–140].

Акрамя набожнасці князя Астрожскага ў тэксце асабліва падкрэсліваецца вернасць гетмана свайму гаспадару – Жыгімонту Казіміравічу. Вобраз правіцеля ВКЛ у «Пахвале» статычны: ён не развіваецца ў дзеянні, пазбаўлены эмоцый і выконвае выключна прадстаўнічыя функцыі – яго асоба ўвасабляе вярхоўную ўладу і дзяржаву ў цэлым, аднак істотна на ход падзей не ўплывае. На «фонавую» сутнасць манарха ў творы паказвае даволі сціплы арсенал этыкетных эпітэтаў, ужытых у адносінах да Жыгімонта – «великаго», «славнаго» ці наўпрост «великославного» ўладара. Этыкетны характар маюць і згадкі пра «науку господарскую», якая разам з «Божею помочю» стала адным з фактараў перамогі пад Оршай: у адным месцы адзначаецца, што войска на чале з Канстанцінам Астрожскім «возма Бога на помоч и въоружени бывше господаря своего Жикгимонта короля наукою, смело дръзнуша и поидоша напротивку много множства людеи великого князя московского», у іншым жа ідзе гаворка пра тое, што гетман «напръвеи божею помочю и приказанем и наукою господаря своего, великого короля Жикгимонта, слушное исправленье воиска, братское любовъное съединение ласкаве злучил и поставил» [18, с. 125]. Падобнага кшталту фармулёўкі адносяцца да стандартных канцылярызмаў той эпохі [2, с. 744–746].

Узаемаадносіны вялікага князя і гетмана ў «Пахвале» цалкам адпавядаюць іх сацыяльным ролям у рэальнай феадальнай іерархіі: уладар аб'яўляе ваенны паход, збірае войска, прызначае гетмана, адорвае трыумфатараў і прымае на сябе гонар перамогі; у сваю чаргу палкаводзец рыхтуе войска, кіруе ім падчас бітвы і ў выніку поспеху падносіць свайму ўладару трафеі. Таму нельга пагадзіцца са сцвярджэннем В. І. Ульяноўскага, нібыта ў творы вобраз гетмана «змагаецца поспехам і славай» з вобразам Жыгімонта Казіміравіча [28, с. 49]. І хаця кожны з герояў займае ў творы сваё месца, усе іх дзеянні падпарадкаваны адной мэце: абароне Айчыны – адзінай і для каталіка Жыгімонта, і для праваслаўнага князя Астрожскага. Яшчэ ў самым пачатку твора адзначаецца, што Жыгімонт пачаў збіраць войска, «хотячи боронити своее очины, Литовское земли» [18, с. 125], а не дзеля адстойвання асабістых вялікакняжацкіх амбіцый. Панегірыст, умоўна звяртаючыся да Астрожскага, піша, што яго перамога пад Оршай уславіць дзяржаву ва ўсім свеце: «Мужства твоего крепость от востока до запада слышати будет; не токмо единому собе, але и всему княжеству Литовскому тую славу и высокость мужства вчинил еси» [18, с. 126]. У сувязі з гэтым нельга не ўзгадаць меркаванне М. С. Грушэўскага пра тое, што «гістарычная арыентацыя» помніка мае выключна палітычны характар і напісаны ён з пазіцый «літоўскага дзяржаўнага патрыятызму» [8, с. 208].

Пры гэтым трэба адрозніваць «гістарычнага» Канстанціна Астрожскага ад яго вобраза ў «Пахвале». Як адзначаў Д. С. Ліхачоў, характарызуючы своеасаблівасць сярэднявечнай канцэпцыі вобраза героя, у цэнтры ўвагі аўтара заўсёды быў менавіта чалавек, але не сам па сабе,

а ў якасці прадстаўніка пэўнага асяроддзя і пэўнай прыступкі ў лесвіцы феадальных адносін [29, с. 27]. У гэтым сэнсе ў «Пахвале» створаны ідэальны вобраз ваяра і абаронцы Айчыны, які павінен служыць прыкладам для наступных пакаленняў. Прынамсі менавіта ў такім ключы дэкларуецца галоўная – патрыятычна-выхаваўчая – мэта твора: «Дело и храбрость мужества доброго и смелого человека годно всим обьявляти, абы напотом иншии тому вчили и смелость мели как же и в нынешнее время случися нам видети того доброго а храброго воина, пореклом стратилата князя Костянтина Ивановича Острозского, навышшего гетмана литовского» [18, с. 125]. З пункту гледжання аўтара «Пахвалы», узорны ваяр у асобе Канстанціна Астрожскага павінен быць дабрадзейным і богабаязным, захоўваць вернасць свайму гаспадару, праслаўляць сваімі ўчынкамі Айчыну і валодаць вайсковымі кампетэнцыямі («справа и наука»).

Апошняя набывае выключную важнасць у кантэксце эпохі. Асобныя фрагменты помніка, у якіх усхваляюцца тактычныя і стратэгічныя здольнасці гетмана («слушное исправленье воиска, братское любовъное съединение ласкаве злучил и поставил» [18, с. 125], «зряжением воиска плъков и его смелого сердца и рукы сягненьем» [18, с. 126] і г. д.), адлюстроўваюць характэрнае для таго часу пераасэнсаванне сюжэтных функцый персанажаў героіка-патрыятычных твораў: палкаводзец больш не ўдзельнічае ў якасці звычайнага воіна – цяпер, у сувязі з маштабнымі зменамі ў самім працэсе вайсковай справы, ад яго патрабуюцца, як правіла, вопыт, а таксама веды ў тактыцы і стратэгіі [30, с. 146]. У панегірыку асабліва падкрэсліваецца, што менавіта «справою и наукою» падначаленыя гетмана «уподобилися есте своим мужством храбрым макидоняном» [18, с. 126]. У цэлым жа войска ВКЛ, якое самаахвярна ідзе ў бой «нащадячи сами себе», называецца ў тэксце не інакш, як «храбрые вдатные витязи», «вдатные и храбрые вои литовские и руские», «храбрыи рыцери» і нават параўноўваецца з рыцарамі вострава Родас, што доўгі час змагаліся супраць туркаў-асманаў: «Прировнани есте великым, храбрым рыцерем славнаго града Родоса, которыи их своим мужством многии замки христианьскии от поганьских рук впокоины чинят» [18, с. 126].

Пры гэтым у творы не назіраецца ніякіх намёкаў на расчалавечванне ворага. Увогуле ў гэтым плане аўтар гранічна нешматслоўны. Свае папрокі ён адрасуе толькі маскоўскаму ўладару Васілію III, але і яго вобраз не дэманізуецца. Даволі паказальна, што панегірыст нават не стаў уключаць у свой тэкст ніякіх параўнанняў такога кшталту з выкарыстанай ім для працы над «Пахвалой» літаратуры.

Завяршаецца ж твор аптымістычным эпілогам у выглядзе здравіцы каралю і вялікаму князю Жыгімонту Казіміравічу і яго гетману. Сярод іншага ў дадзеным фрагменце прысутнічае і пажаданне новых перамог – над татарамі: «Великославному господарю королю Жикгимонту Казимировичу буди честь и слава на векы, побдившему недруга своего великого князя Василиа московского, а гетману его, вдатному князю Костянтину Ивановичу Острозскому даи боже здоровье и щастье вперед лепшее как ныне; побил силу великую московскую, абы так побивал силную рать татарскую, проливаючи кров их бесурменьскую» [18, с. 127].

Высновы. У вядомым нам выглядзе тэкст «Пахвалы» быў створаны ў першай палове 1520-х гг. аўтарам праваслаўнага веравызнання, знаёмым з тагачаснай рэлігійнай і свецкай літаратурай. З дапамогай не заўсёды ўдала ўплеценых у тканіну твора гістарычных аналогій, біблейскіх цытат і перыфразаў ананімны панегірыст намагаўся паказаць значнасць бітвы пад Оршай і ўзвялічыць галоўнага творцу перамогі – князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага, чыя гераічная асоба павінна была стаць прыкладам для наступных пакаленняў. Гіпербалізавана апісваючы свайго героя і згаданую падзею, аўтар адлюстраваў у асобе гетмана ідэальны вобраз абаронцы роднай зямлі, якому ўласцівы вернасць (Айчыне, народу і ўладару), богабаязнасць і дасведчанасць у вайсковай справе. Фактычна ў «Пахвале» знайшоў сваё тэкставае ўвасабленне нефармальны «рыцарскі» кодэкс гонару, што склаўся на фоне актуальнага для таго часу сацыяльна-палітычнага кантэксту.

Па сутнасці, «Пахвала» стала адным з першых помнікаў даўняга беларускага пісьменства, у якім выказаны патрыятычныя погляды прыватнай асобы праваслаўнага веравызнання ў іх агульнадзяржаўным значэнні, а не ў вузкім рэгіянальным ці этнаканфесіянальным. Інакш кажучы, для складальніка «Пахвалы» дзяржаўны патрыятызм з'яўляўся інварыянтнай катэгорыяй культуры.

Неабходна канстатаваць, што «Пахвала» з'яўляецца цэласным творам як у кампазіцыйным, так і ў ідэйна-зместавым плане. Пры гэтым помнік мае выразныя рысы воінскай аповесці, хаця цалкам і не належыць да гэтага жанру. Асаблівасці сюжэтнай структуры, вобразнай сістэмы і сродкаў мастацкай выразнасці яднаюць дадзены твор з лепшымі ўзорамі старажытнарускай літаратурнай героіка-эпічнай традыцыі.

Усё адзначанае вышэй надае дадатковую актуальнасць далейшаму вывучэнню «Пахвалы» і сведчыць пра яе высокую ідэйна-мастацкую вартасць і выключную эстэтычную каштоўнасць у корпусе твораў даўняй беларускай літаратуры.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Улащик, Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н. Н. Улащик. – М.: Наука, 1985. – 261 с.
2. Кананович, У. І. «Пахвала князя Канстанціна Астрожскага» як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ пачатку XVI стагоддзя / У. І. Кананович // Arche. – 2014. – № 12 (133). – С. 736–752.
3. Siemianczuk, A. Latopisy o bitwe pod Orszą / A. Siemianczuk // Mówią Wieki. – 2014. – № 9. – S. 68–73.
4. Гаранін, С. Л. Позняе Сярэднявечча / С. Л. Гаранін, В. А. Чамярыцкі // Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. – Мінск, 2006. – Т. 1: Даўняя літаратура, XI – першая палова XVIII стагоддзя. – С. 149–221.
5. Ластоўскі, В. Ю. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя / В. Ю. Ластоўскі. – Коўна: Друк. Сакалоўскага і Лана, 1926. – 776 с.
6. Саверчанка, І. В. Жанравая шматстайнасць старабеларускай прозы X–XVIII стст.: праблемы атрыбуцыі і класіфікацыі / І. В. Саверчанка // Аксиологический диапазон художественной литературы: сб. науч. ст. / под науч. ред. В. Ю. Боровко, О. В. Лапатинской; сост.: В. Ю. Боровко [и др.]. – Витебск, 2017. – С. 233–237.
7. Чамярыцкі, В. А. Валынскі кароткі летапіс / В. А. Чамярыцкі // Вялікае Княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 3 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск, 2007. – Т. 1: А-К. – С. 385.
8. Грушевський, М. С. Історія української літератури: в 6 т., 9 кн. / М. С. Грушевський. – Київ: Либідь, 1993–1996. – Т. 5, кн. 1: Культурні і літературні течії на Україні в XV–XVI вв. і перше відродження (1580–1610 рр.) / упоряд. і прим. С. К. Росовецький. – 1995. – 255 с.
9. Русина, Е. В. Волынская краткая летопись: состав и проблема авторства / Е. В. Русина // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2018. – Вып. 11. – С. 154–172.
10. Русина, О. В. «Сказання про перемогу князя Костянтина Острозького під Оршею»: структура та джерела / О. В. Русина // Український історичний журнал. – 2016. – № 1. – С. 133–149.
11. Данилевский, И. Н. Герменевтические основы изучения летописных текстов: Повесть временных лет / И. Н. Данилевский. – Изд. 2-е, перераб. и доп. – СПб.: Изд-во Олега Абышко, 2019. – 438 с.
12. Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси: изд. при Упр. Вилен. учеб. округа. – Вильна: Печатня О. Блюмовича, 1870. – Т. 9. – X, 486 с.
13. Владимиров, П. В. Обзор южнорусских и западнорусских памятников письменности от XI до XVII ст. / П. В. Владимиров // Чтения в историческом обществе Нестора-Летописца. – Киев, 1890. – Кн. 4. – С. 102–139.
14. Супрасльская рукопись, содержащая Новгородскую и Киевскую сокращенные летописи / подгот. и изд. М. А. Оболенским. – М.: Синод. тип., 1836. – XXIV, 172, 32 с.
15. Новикова, О. Л. К истории изучения Супрасльского летописного сборника в первой трети XIX в. / О. Л. Новикова // Труды Отдела древнерусской литературы: [в 71 т.] / Рос. акад. наук, Ин-т рус. лит. (Пушкин. дом). – СПб., 1996. – Т. 50. – С. 384–386.
16. Тиховский, Ю. И. Так называемая «Краткая киевская летопись» / Ю. И. Тиховский // Киевская старина. – 1893. – Т. 42. – С. 364–374.
17. Арнаутов, В. А. «Киевская» летопись Супрасльского сборника: к вопросу о смоленском летописании / В. А. Арнаутов // Известия отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. – 1909. – Т. 14, кн. 3. – С. 1–34.
18. Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи белорусско-литовские / Акад. наук СССР, Ин-т истории. – М.: Наука, 1980. – 306 с.
19. Александрия: роман об Александре Македонском по русской рукописи XV в. / подгот.: М. Н. Ботвинник, Я. С. Лурье, О. В. Творогов. – Л.; М.: Наука, 1965. – 269 с.
20. Полное собрание русских летописей. Т. 6, вып. 1. Софийская первая летопись старшего извода. – М.: Яз. рус. культуры, 2000. – VIII, 581 с.
21. Полное собрание русских летописей. Т. 3. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М.: Яз. рус. культуры, 2000. – XI, 692 с.
22. Анталогія даўняй беларускай літаратуры, XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ.; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 1015 с.
23. Сушицькій, Т. П. Західноруські літописи як пам'ятки літератури. Ч. II / Т. П. Сушицькій // Праці з історії письменства давньої України. – Київ, 1929. – Т. 1. – С. 137–404.

24. Выголексинский сборник: [древнерус. текст] / подгот.: В. Ф. Дубровина, Р. В. Бахтурина, В. С. Голышенко; под ред. С. И. Коткова. – М.: Наука, 1977. – 648 с.

25. Чамярыцкі, В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў / В. А. Чамярыцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 191 с.

26. Трофимова, Н. В. Поэтика древнерусского воинского повествования / Н. В. Трофимова. – М.: МПГУ, 2017. – 275 с.

27. Ярушевич, А. В. Ревнитель православия, князь Константин Иванович Острожский (1461–1530) и православная Литовская Русь в его время / А. В. Ярушевич. – Смоленск: Типолит. С. Гуревич, 1896. – 250 с.

28. Ульяновський, В. І. «Славний для всіх часів чоловік»: князь Костянтин Іванович Острозький / В. І. Ульяновський. – Острог: Остроз. акад., 2009. – 168 с. – (Серія «Видатні постаті Острогіани»; вип. 2).

29. Лихачев, Д. С. Человек в литературе Древней Руси / Д. С. Лихачев. – М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1958. – 186 с.

30. Мелихов, М. В. «Мечом и глаголом»: героическая традиция в русской литературе XII–XVII вв. / М. В. Мелихов. – М.; СПб.: Центр гуманитар. инициатив, 2018. – 320 с.

References

1. Ulashchik N. N. *Introduction to the study of the Belarusian-Lithuanian chronicles*. Moscow, Nauka Publ., 1985. 261 p. (in Russian).

2. Kananovich U. I. «Praise to Prince Konstantin Ostrozhsky» as a source for the study of the identity of the Orthodox elite of the Grand Duchy of Lithuania at the beginning of the 16th century. *Arche,* 2014, no. 12 (133), pp. 736–752 (in Belarusian).

3. Siemianczuk A. Latopisy o bitwe pod Orszą. *Mówią Wieki*, 2014, no. 9, pp. 68–73 (in Polish).

4. Garanin S. L., Chamyarytski V. A. Late Middle Ages. *History of the Belarusian literature of the 11th – 19th centuries. Vol. 1. Old literature: the 11th – the first part of the 18th century*. Minsk, 2006, pp. 149–221 (in Belarusian).

5. Lastouski V. Yu. *History of Belarusan (Creeve) book. An attempt of explanational description from the end of 10th to the beginning of 19th century*. Kovno, Sakalouski and Lan Publ., 1926. 776 p. (in Belarusian).

6. Saverchanka I. V. Genre diversity of Old Belarusian prose of the 10th–18th: problems of attribution and classification. *Aksiologicheskii diapazon khudozhestvennoi literatury: sbornik nauchnykh statei* [Axiological range of fiction: a collection of scientific articles]. Vitebsk, 2017, pp. 233–237 (in Belarusian).

7. Chamyarytski V. A. Volynian short Chronicle. *Grand Duchy of Lithuania: encyclopedia. Vol. 1.* 2nd ed. Minsk, 2007, p. 385 (in Belarusian).

8. Grushevs'kii M. S. *History of Ukrainian literature. Vol. 5, part 1. Cultural and literary trends in Ukraine in the 15th–16th centuries and the first revival (1580–1610)*. Kyiv, Lybid' Publ., 1995. 255 p. (in Ukrainian).

9. Rusina E. V. The shorter Volhynian chronicle: the contents and problem of authorship. *Studia Historica Europae Orientalis.* Minsk, 2018, iss. 11, pp. 154–172 (in Russian).

10. Rusina O. V. «Tale about the victory of Prince Konstantin Ostrozhsky near Orsha»: structure and sources. *Ukraïns'kii istorichnii zhurnal = Ukrainian Historical Journal*, 2016, no. 1, pp. 133–149 (in Ukrainian).

11. Danilevskii I. N. *Hermeneutical foundations of the study of the annalistic texts. The Tale of Bygone Years*. 2nd ed. St. Petersburg, Oleg Abyshko Publ., 2019. 438 p. (in Russian).

12. *The archaeographic collection of documents related to the history of North-Western Russia. Vol. 9.* Vilno, O. Blumovich Publ., 1870. X, 486 p. (in Russian).

13. Vladimirov P. V. Review of South Russian and Western Russian written works from the 11th to the 17th centuries. *Readings in the Historical Society of Nestor the Chronicler*. Kiev, 1890, bk. 4, pp. 102–139 (in Russian).

14. Obolenskii M. A. (prepared). *Suprasl manuscript containing Novgorod and Kiev abbreviated chronicles*. Moscow, Synodal printing house, 1836. XXIV, 172, 32 p. (in Russian).

15. Novikova O. L. On the history of studying the Suprasl chronicle collection in the first third of the 19th century. *Works of the Department of Old Russian Literature. Vol. 50*. St. Petersburg, 1996, pp. 384–386 (in Russian).

16. Tikhovskii Yu. I. So-called «Short Kievan Chronicle». *Kievskaya starina* [Kievan Antiquity], 1893, vol. 42, pp. 364–374 (in Russian).

17. Arnautov V. A. «Kievan» chronicle of Suprasl collection: to the question of the Smolensk chronicles. *Izvestiya otdeleniya russkogo yazyka i slovesnosti Imperatorskoi Akademii nauk* [News of the Department of Russian Language and Literature of the Imperial Academy of Sciences], 1910, vol. 14, bk. 3, pp. 1–34 (in Russian).

18. *Complete collection of Russian chronicles. Vol. 35. Belarusian-Lithuanian chronicles*. Moscow, Nauka Publ., 1980. 306 p. (in Russian).

19. Botvinnik M. N., Lur'e Ya. S., Tvorogov O. V. (comp.). *Alexandria: a novel about Alexander the Great based on a Russian manuscript of the 15th century*. Leningrad, Moscow, Nauka Publ., 1965. 269 p. (in Russian).

20. *Complete collection of Russian chronicles. Vol. 6, part 1. Sofia chronicle of the older recensions.* Moscow, Yazyki russkoi kul'tury Publ., 2000, VIII. 581 p. (in Russian).

21. *Complete collection of Russian chronicles. Vol. 3. Novgorod chronicle of senior and junior recensions.* Moscow, Yazyki russkoi kul'tury Publ., 2000, XI, 692 p. (in Russian).

22. Chamyarytski V. A. (ed.). *Anthology of Old Belarusian literature: 11th – first half of 18th century*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2003. 1015 p. (in Belarusian).

23. *Sushits'kii T. P.* Western Russian chronicles as works of literature. Part II. *Works on the history of writing in Old Ukraine. Vol. 1.* Kyiv, 1929, pp. 137–404 (in Ukrainian).

24. Kotkov S. I. (ed). *Vygoleksin collection*. Moscow, Nauka Publ., 1977. 648 p. (in Russian).

25. Chamyarytski V. A. *Belarusian chronicles as works of literature: genesis and literary history of the first chronicles*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1969. 191 p. (in Belarusian).

26. Trofimova N. V. *Poetics of Old Russian military tales*. Moscow, Moscow Pedagogical State University, 2017. 275 p. (in Russian).

27. Yarushevich A. V. *Zealot of Orthodoxy, Prince Konstantin Ivanovich Ostrozhsky (1461–1530) and Orthodox Lithuanian Rus in his time*. Smolensk, S. Gurevich Publ., 1896. 250 p. (in Russian).

28. Ul'yanovs'kii V. I. «*Glorious man for all time»: Prince Konstantin Ivanovich Ostrozhsky*. Ostroh, Ostroh Academy, 2009. 168 p. (in Ukrainian).

29. Likhachev D. S. *Human in the literature of Old Rus'*. Moscow, Leningrad, Academy of Sciences USSR, 1958. 186 p. (in Russian).

30. Melikhov M. V. *«By sword and verb». Heroic tradition in Russian literature of the 12th–17th centuries*. Moscow, St. Petersburg, Center for humanitarian initiatives, 2018. 320 p. (in Russian).

Информация об авторе

Метелица Кирилл Игоревич – аспирант. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: kmiatsel@gmail.com

Information about the author

Kiryl I. Miatselitsa – Postgraduate student. Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: kmiatsel@gmail.com

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

УДК 347.77
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-142-150

Поступила в редакцию 02.08.2024
Received 02.08.2024

Н. Ф. Павлова, Н. Г. Луганская, А. Н. Гавриш

Белорусский институт системного анализа и информационного обеспечения научно-технической сферы, Минск, Беларусь

НАПРАВЛЕНИЯ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ ПРАВОВОГО РЕГУЛИРОВАНИЯ ГОСУДАРСТВЕННОЙ НАУЧНОЙ И ГОСУДАРСТВЕННОЙ НАУЧНО-ТЕХНИЧЕСКОЙ ЭКСПЕРТИЗ

Аннотация. В статье указаны основные направления совершенствования правового регулирования государственной научной и государственной научно-технической экспертиз. Рассмотрена необходимость закрепления на уровне законодательства механизма привлечения в рабочее время высококвалифицированных специалистов для осуществления ими полномочий членов государственных экспертных советов, а также явки по приглашению в качестве эксперта, участия в заседаниях секции или бюро экспертных советов. Приведено обоснование того, что деятельность по обеспечению проведения государственной экспертизы для всех лиц, привлекаемых к данным мероприятиям, является неотъемлемой государственной обязанностью. Рассмотрена необходимость принятия Кодекса профессиональной этики экспертов в сфере государственной научной и государственной научно-технической экспертиз, раскрыты основные принципы и правила профессионального поведения государственного эксперта, внимание эксперта акцентировано на необходимости предоставления достоверных, полных и обоснованных экспертных заключений, добросовестное исполнение своих профессиональных обязанностей, принятия всех необходимых мер для своевременного и качественного рассмотрения материалов экспертизы.

Ключевые слова: государственная научная и государственная научно-техническая экспертиза, эксперт, кодекс профессиональной этики эксперта

Для цитирования: Павлова, Н. Ф. Направления совершенствования правового регулирования государственной научной и государственной научно-технической экспертиз / Н. Ф. Павлова, Н. Г. Луганская, А. Н. Гавриш // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2025. – Т. 70, № 2. – С. 142–150. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-142-150

Natallia F. Pavlova, Nadejda G. Luganskaya, Aleksandr N. Gavrish

Belarusian Institute of System Analysis and Information Support of Scientific and Technical Sphere, Minsk, Belarus

DIRECTIONS FOR IMPROVING THE LEGAL REGULATION OF STATE SCIENTIFIC AND STATE SCIENTIFIC AND TECHNICAL EXPERTISE

Abstract. The article specifies the main directions for improving the legal regulation of state scientific and state scientific and technical expertise. The need to consolidate at the legislative level the mechanism for attracting highly qualified specialists during working hours to exercise their powers as members of state expert councils, as well as to appear upon invitation as an expert, participate in meetings of the section or bureau of expert councils is considered. The rationale is given for the fact that the activity to ensure the conduct of state expertise for all persons involved in these events is an integral state responsibility. The need to adopt the Code of Professional Ethics of Experts in the Sphere of State Scientific and State Scientific and Technical Expertise is considered, the basic principles and rules of professional conduct of a state expert are disclosed, the expert's attention is focused on the need to provide reliable, complete and substantiated expert opinions, conscientious fulfillment of their professional duties, taking all necessary measures for timely and high-quality consideration of the examination materials.

Keywords: state scientific and state scientific and technical expertise, expert, code of professional ethics of an expert

© Павлова Н. Ф., Луганская Н. Г., Гавриш А. Н., 2025

For citation: Pavlova N. F., Luganskaya N. G., Gavrish A. N. Directions for improving the legal regulation of state scientific and state scientific and technical expertise. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2025, vol. 70, no. 2, pp. 142–150 (in Russian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-142-150

Введение. Наблюдаемая в последние годы геополитическая нестабильность и международные ограничения, сдерживающие международный трансфер в республику технологий, оборудования, услуг, программного обеспечения, создают, с одной стороны, риски для развития экономики, а с другой – открывают новые возможности для эффективного развития и использования отечественных разработок.

Проводимые в стране научные исследования являются основой для создания новых технологий и продуктов, которые могут стать ключевыми элементами не только экономического развития страны, но и будут направлены на обеспечение технологической безопасности.

Наука является ядром технологического суверенитета, а ее эффективное использование на благо государства требует совершенствования системы государственного управления научно-техническим развитием, в том числе нормативно-правового обеспечения проведения государственной научной и государственной научно-технической экспертиз (далее – государственная экспертиза) как ключевого инструмента регулирования целевого расходования бюджетных средств, выделяемых на поддержку научных исследований.

Основная часть. Эффективность управления научно-техническим развитием, темпы экономического роста во многом определяются качеством государственной экспертизы. Государственная экспертиза позволяет сформировать конкурентоспособные на мировом рынке материалы и технологии в связи с тем, что на всех этапах проекта – от конкурсного отбора до окончания работ по проекту – экспертиза позволяет отобрать наиболее перспективные проекты, оценить объемы работ по проекту и риски его невыполнения, к которым могут относиться некомпетентность исполнителей, недостаточная материально-техническая база организации – исполнителя работ, отсутствие сырья или материалов, риски загрязнения окружающей среды или нанесения вреда здоровью человека проведением работ по проекту, недостижимость заявленных характеристик конечного продукта и др.

Ежегодно государственную экспертизу проходят более 1000 объектов экспертизы (в 2022 г. – 1196, в 2023 г. – 1158), из них около 13 % государственные экспертные советы (далее – ГЭС) в связи с отсутствием новизны и актуальности предлагаемых технических решений не рекомендуют к финансированию за счет средств республиканского бюджета. От 70 до 100 объектов экспертизы ежегодно возвращаются государственным заказчикам без рассмотрения на заседаниях ГЭС в связи с получением отрицательных заключений всех экспертов, привлекаемых к проведению государственной экспертизы.

В настоящее время законодательной основой проведения в Республике Беларусь государственной экспертизы являются Закон Республики Беларусь от 19 января 1993 г. № 2105-XII «Об основах государственной научно-технической политики» (ст. 13), Закон Республики Беларусь от 21 октября 1996 г. № 708-XIII «О научной деятельности» (ст. 5^3), Закон Республики Беларусь от 10 июля 2012 г. № 425-З «О государственной инновационной политике и инновационной деятельности» (ст. 24). Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 22 мая 2015 г. № 431 утверждено Положение о порядке функционирования единой системы государственной научной и государственной научно-технической экспертиз (далее – Положение о государственной экспертизе).

Несмотря на наличие указанных нормативных правовых актов, многие принципиальные вопросы, связанные с организацией и проведением государственной экспертизы, до настоящего времени остаются нерешенными.

